# З НОВЫМ ГОДАМ, СЯБРЫ!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 38 (1150) ● 30 снежня 1976 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.



Адзін толькі лісток календара перагорне апошні снежаньскі дзень, і — 1976 год перашагне ў нашу памяць. Гэта быў год гістарычнага XXV з'езда КПСС, год-працаўнік, год-змагар.

А мы ўступім у новы, нязведаны і таму крыху таямнічы — 1977 год, які, як малодшы брат мінулага года, абяцае таксама быць працаўніком і будаўніком, змагаром і пераможцай таму, што поспехі і здзяйсненні года складаюцца з нашых з вамі вялікіх і малых працоўных спраў, перамог і здзяйсненняў.

Кожны з нас у гэтыя дні, даючы ацэнку адыходзячаму году, складае працоўныя і асабістыя планы на год надыходзячы. І ў гэтых планах — навуковыя даследаванні і адкрыцці, штодзённая праца і грамадская работа, лекцыі, семінары, практычныя, здадзеныя сесіі і атрыманыя дыпломы, падрыхтаваныя і абароненыя кандыдацкія і доктарскія, творчыя паездкі і сустрэчы з сябрамі, спартыўныя перамогі... Ці магчыма пералічыць нават тое, што можа ўвабраць у сябе адзін год толькі ў рамках аднаго нашага універсітэта!

Але зараз кожны — і той, хто трымае ў руках студэнцкую залікоўку ў чаканні надыходзячай чарговай сесіі, і той, хто даўно ўжо перарос студэнцкі ўзрост, — усе студэнты, выкладчыкі, аспіранты і супрацоўнікі універсітэта мараць ажыццявіць свае планы так, каб у залікоўках жыцця стаялі толькі добрыя і выдатныя адзнакі.

Дык са святам, сябры, з Новым годам, з новымі здзяйсненнямі!

*Навагоднае інтэрв'ю*

1976 СНЕЖАНЬ 31 ПЯТНІЦА

## Чым знамянальны быў мінулы год?

### На пытанне «Беларускага універсітэта» адказваюць:

**УЛАДЗІМІР ПУЗІКАЎ, намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ па вучэбнай і навуковай рабоце:**

— У 1976 годзе я закончыў гістарычны факультэт.

У маі праходзіў другі тур VI Усесаюзнага конкурсу па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднаму руху моладзі. Мне давялося ў ім прымаць удзел. З вялікай радасцю даведаўся, што мая работа па тэме «Аб'ектыўныя асновы эканамічнай палітыкі партыі і дзяржавы пры сацыялізме» была ў ліку лепшых. Для мяне гэта вельмі прыемна. Для поўнага раскрыцця тэмы патрэбны былі не толькі атрыманыя ва універсітэце веды, але і ўласны практычны вопыт. І ў гэтым мне вельмі дапамагла грамадская работа. Па выніках конкурсу я атрымаў Грамату ЦК ВЛКСМ і Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР.

Назаўсёды застанецца ў памяці той хвалюючы сакавіцкі дзень, калі мяне прымалі кандыдатам у члены КПСС. Каб апраўдаць гэтае ганаровае званне, мне трэба яшчэ больш працаваць над уласным удасканальваннем.

У верасні здаў уступныя экзамены ў аспірантуру. І ў цяперашні час працягваю займацца тут. Бліжэйшыя планы на будучыню — закончыць аспірантуру і здаць кандыдацкі мінімум.

**ТАЦЦЯНА ШУМІЛІНА, студэнтка IV курса біяфака, ленінскі стыпендыят, сакратар камітэта камсамола факультэта:**

— Прайшоўшы год быў вельмі адказны ў маёй вучобе ва універсітэце. У гэтым годзе адбылося размеркаванне студэнтаў нашага курса па кафедрах. А выбар напрамку сваёй спецыялізацыі, вядома, не менш сур'ёзны крок, чым выбар прафесіі наогул.

Найбольш памятнай падзеяй года была для мяне вытворча-азнаямленчая практыка ў Гальскім універсітэце імя Марціна Лютэра ў ГДР. Аб усім, што я там убачыла, не раскажаш у двух словах, было вельмі многа цікавага.

Прыйшоў Новы год, а разам з ім і зімовая сесія ў студэнтаў— сур'ёзны, складаны, адказны экзамен. І цяпер я чакаю сесіі, якая будзе праверкай не толькі маёй падрыхтоўкі, але і ацэнкай работы нашай камсамольскай арганізацыі, якая вядзецца пад дэвізам «Ніводнага адстаючага побач!».

**АЛЯКСАНДР ГРЫНКЕВІЧ, студэнт IV курса юрфака, сакратар камітэта камсамола факультэта:**

— Год вучобы прайшоў непрыкметна. Шмат чаго ўбачана, шмат засталося ў памяці. Аб усім расказаць немагчыма.

Вучыцца ва універсітэце я пачаў на падрыхтоўчым аддзяленні. З тае пары кожнае лета працаваў у студэнцкіх будаўнічых атрадах. У мінулым годзе быў выбран камандзірам занальнага будаўнічага атрада. Добрую памяць аб сабе пакінулі нашы хлопцы ў жыхароў Крупскага раёна. Ганаровая грамата Мінскага абкома і аблвыканкома — лепшы доказ нашай заўзятай працы.

Мне аказалі вялікі давер, выбраўшы сакратаром камітэта камсамола факультэта. Сумаваць не прыходзіцца — проста няма часу. Працягваю асвойваць будучую прафесію. Выдатная вучоба для мяне — правіла жыцця.

Карыстаючыся магчымасцю, хачу ад усяго сэрца павіншаваць усіх выкладчыкаў і студэнтаў з наступаючым Новым годам.

**ЛІЛІЯ МЕЛЕЖ, студэнтка IV курса філфака:**

— Кожны пражыты дзень не можа не пакінуць свой след у жыцці чалавека. Ці не ўсміхаемся мы першаму сонечнаму промню, што палыхае золатам; альбо ці не засумуем мы раптам, калі за акном ліне халодны дождж?.. Так і час. Бяжыць ён, гады мільгаюць, а ўсё ж нездарма. Скажам, мінулы 76-ы. Многа было цудоўнага ў маім жыцці. Зараз нават цяжка сказаць, што больш знамянальна. Як найбольш шчаслівыя ўспамінаю дні, якія прайшлі побач з дзецьмі. І як найбольш цяжкія, бо працаваць з дзецьмі, людзьмі будучага — справа, ох, якая нялёгкая!

Усім зразумела, што першыя крокі ў педагогіцы — гэта і няўдачы, і слабасць, можа нават слёзы, але і прыемнае адчуванне, што ў цябе нешта атрымліваецца. Гэта я магу сказаць і пра сябе, і пра сваіх сяброўак па вучобе. Нямнога засталося да таго дня, калі ціха, але смела ты, настаўнік, зойдзеш у клас і скажаш: «Добры дзень, дзеці!»

Вось і хочацца мне, каб будучы год стаў годам першых поспехаў, шчаслівых, як сам Новы год, дзён.

**Інтэрв'ю правялі слухачы падрыхтоўчага аддзялення БДУ (група журналістаў) Мікалай ДУБОВІК і Мікалай ФЕДАРЭНКА.**

# Навіны

## У парткоме і савеце

**У МІНУЛЫ ПАНЯДЗЕЛАК ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ АДБЫЛОСЯ СУМЕСНАЕ ПАСЯДЖЭННЕ ПАРТКОМА І САВЕТА БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.**

З дакладам «Аб узмацненні ролі і дзейснасці крытыкі і самакрытыкі ў паляпшэнні якасці і эфектыўнасці работы партыйных арганізацый, дэканатаў, кафедр, аддзелаў і служб па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў» выступіў сакратар парткома універсітэта М. С. Гарашчук.

Прысутнічаючыя прынялі актыўны ўдзел у абмеркаванні даклада. У спрэчках выступілі загадчык кафедры палітэканоміі гуманітарных факультэтаў У. Драчоў, дэканы факультэтаў Я. Іваноў, А. Пікулеў, В. Чыгір, М. Гарбачоў, намеснік сакратара парткома У. Наумовіч.

Справаздача аб пасяджэнні будзе апублікавана ў чарговым нумары.

## Дзве даты

**У БДУ АДБЫЎСЯ ГАРАДСКІ ЎРАЧЫСТЫ СХОД, ПРЫСВЕЧАНЫ ДЗВЮМ ДАТАМ:**

30-годдзю з пачатку падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй для сацыялістычных краін у вучэбных установах СССР і 15-годдзю падрыхтоўкі такіх спецыялістаў у нашым універсітэце. На вечары з расказам аб замежных студэнтах-выхаванцах БДУ, аб сувязях ВНУ БССР з ВНУ сацыялістычных краін выступіў намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Ф. Капуцкі.

А. МАРЧУК.

## Вынікі рэйду

**НЯДАЎНА ЖЫЛЛЁВА-БЫТАВАЯ КАМІСІЯ ПРАФКОМА БДУ ПРАВЕРЫЛА РАБОТУ КІРАЎНІЦТВА ІНТЭРНАТА № 2.**

Вынікі рэйду паказалі, што студсавет інтэрната нядрэнна спраўляецца са сваімі абавязкамі. На паверхах аформлены дошкі дакументацыі з графікамі дзяжурстваў, экранамі санправерак, у пакоях студэнтаў— чысціня і парадак. Складзены планы культурна-выхаваўчай і арганізацыйнай работы. На паверхах маюцца цудоўна аформленыя ленінскія пакоі (выключэнне складае паверх, дзе жывуць біёлагі).

Але рэйд выявіў і шэраг недахопаў. У некаторых пакоях няма тумбачак, радыёпрыёмнікаў, настольных лямп і нават ложкаў. Камісія выявіла прычыны такой неарганізаванасці і прыняла меры да іх ліквідавання.

В. ЕРМАКОЎ, член камісіі.

## Канферэнцыя СНТ

**НА БІЯФАКУ ПРАЙШЛА ТРАДЫЦЫЙНАЯ НАВУКОВАЯ СТУДЭНЦКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ, ПРЫСВЕЧАНАЯ ЛАЎРЭАТАМ УСЕСАЮЗНАГА І РЭСПУБЛІКАНСКАГА АГЛЯДАЎ СТУДЭНЦКІХ НАВУКОВЫХ РАБОТ.**

На пасяджэннях дзвюх секцый—экалогіі і эксперыментальнай біялогіі —было заслухана 16 дакладаў.

Вынікі сваіх даследаванняў прадставілі на канферэнцыю галоўным чынам студэнты IV—V курсаў. Сярод малодшакурснікаў вылучыўся Барыс Аношанка. Яго даклад «Палітэнныя храмасомы як мадэль інтэрфазных храмасом» выклікаў цікавасць прысутных.

Па выніках канферэнцыі лепшыя работы былі рэкамендаваны для разгляду ў іншых ВНУ краіны.

СЕКТАР ДРУКУ СНС БДУ.

25 СНЕЖНЯ

# УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК:

## «...Я ПАМЯТАЮ ЦУДОЎНАЕ ІМГНЕННЕ...»

— Добры вечар! У эфіры чарговая перадача нашай дыскпанарамы, — гучыць голас дыктара.

...Вось ужо пяты выпуск такой перадачы слухаюць жыхары інтэрната № 7. А рыхтуюць яе студэнты механіка-матэматычнага факультэта пад кіраўніцтвам студэнта III курса, адказнага за культурна-масавы сектар камітэта камсамола факультэта Аляксандра Халімановіча. Вядуць перадачу студэнт II курса Вячаслаў Калюта і трэцякурсніца Тамара Струк. А член студсавета Віктар Ганчароў—тэхнічны афарміцель дыск-панарамы.

Радыёвузел існаваў у інтэрнаце і раней. Студэнты-мехматаўцы арганізавалі выхад у эфір сваёй інфармацыйна-музычнай перадачы аб жыцці на факультэце, рабоце камітэта камсамола, аб адпачынку і быце. Адзін з выпускаў перадачы быў цалкам прысвечан пераклічцы студэнцкіх будаўнічых атрадаў, якія працавалі ў Беларусі, Малдавіі, Казахстане, у раёнах Нечарназем'я. Ветэраны СБА дзяліліся сваім вопытам з навічкамі.

...Гучыць «Лунная саната» Л. Бетховена, яе змяняе «Вальс кветак» І. Баха. І зусім забываешся, што за акном ужо зіма. Перад табой зноў блакітнае неба і мора кветак...

Сёння, 25 снежня, у эфіры гучаць літаратурна-музычная кампазіцыя «Я памятаю цудоўнае імгненне», класічная музыка, вершы сучасных паэтаў...

— Мы выконваем не толькі заяўкі на эстрадныя мелодыі, але імкнёмся таксама прывіць любоў нашым слухачам і да класічнай музыкі. Другі канцэрт С. Рахманінава, музыка Э. Грыга, П. Чайкоўскага, вершы В. Шэкспіра, А. Твардоўскага, М. Забалоцкага карыстаюцца вялікай папулярнасцю. Нядаўна прагучаў расказ пра ансамбль «Песняры».

— Музычныя і літаратурныя запісы мы рыхтуем самі. Вялікую работу ў гэтым напрамку вядуць А. Халімановіч і В. Ганчароў, — гаворыць Оля Шафранская, намеснік сакратара камітэта камсамола па арганізацыйнай рабоце.

Перадача мехматаўцаў ідзе больш гадзіны. Яе слухаюць студэнты фізічнага, філалагічнага факультэтаў, замежныя студэнты, якія жывуць у інтэрнаце. Хутка ў эфіры прагучыць музычная праграма, падрыхтаваная стажорамі з ГДР.

**Н. АЎРАМАВА.**

## САМАЯ ВЫСОКАЯ МАРА

Вышыня... Яна ёсць у кожнага чалавека. Вялікая ці малая — у залежнасці ад духоўных патрэбнасцей, — але ўсё ж-такі ёсць. Толькі калі для многіх гэта панятце крыху абстрактнае, то для Ларысы Клемянцёнак, студэнткі II курса біяфака, яно даволі канкрэтнае — адразу асацыіруецца з умоўнай планкай, якая ўстаноўлена на вышыні... 200 сантыметраў. Вельмі ўжо «высокая вышыня»? Магчыма. Але ж нездарма кажуць, што дрэнны той салдат, які не марыць стаць генералам. Не будзем паўтараць старыя, як свет, ісціны, лепш звернемся да самой Ларысы.

Зусім нядаўна яна прыняла ўдзел у пятым міжнародным турніры па скачках у вышыню на прыз Героя Савецкага Саюза Зіны Партновай, што праходзіў у Віцебску. З вынікам 181 см Ларыса Клемянцёнак заняла першае месца сярод жанчын.

— Ларыса, як ты ацэньваеш сваё апошняе выступленне?

— Добра, але можна было і лепш.

— У такім выпадку які са скачкоў ты лічыш самым лепшым?

— Кожны артыст лічыць самай лепшай яшчэ не выкананую ролю, пісьменнік — самым лепшым яшчэ не напісаны раман. Так і мы, спартсмены. Самы лепшы скачок той, які наперадзе. Бо калі лічыць, што ты ўжо дасягнуў усяго, чаго мог, то не будзе руху наперад, да больш высокіх паказчыкаў.

— Што ж дапамаге, па-твойму, дабівацца гэтых высокіх паказчыкаў?

— Вельмі проста адказаць на гэтае пытанне: трэніроўкі, трэніроўкі і яшчэ раз трэніроўкі. Напружаная, творчая, з душой.

— А як жа талент?

— Каб не быць шматслоўнай, я б хацела адказаць словамі Міхаіла Святлова: «Патрэбен, вядома, талент. Потым патрэбна вялікая перакананасць, патрэбна любоў... Затым патрэбна майстэрства. Затым трэба захаваць у сабе стан заўсёднай работы...»

— Напэўна, не апошняя роля ў перамогах спартсмена адводзіцца трэнеру?

— Вядома! Мне ўвесь час шанцавала на цудоўных людзей, сапраўдных спартыўных выхавацеляў. Першым трэнерам быў Мікалай Фёдаравіч Рабаконь. Ён навучыў па-сапраўднаму любіць спорт, выхоўваў волю да перамогі. А зараз я трэніруюся ў Елізаветы Іванаўны Сосінай. Яна дае бліскучыя ўрокі спартыўнага майстэрства. Гэтыя ўрокі не забываюцца, у «нікуды» не знікаюць — абавязкова выяўляюцца ў кожным выступленні.

— Зараз, Ларыса, некалькі слоў пра тое, як ты спалучаеш вучобу і спорт.

— Для мяне не існуе дылемы— біялогія або спорт. Гэта, вядома, цяжка, але я пароўну дзялю паміж імі сваю душу. Спорт дапамагае быць сабранай, дысцыплінаванай, працаздольнай, ён вучыць кіраваць часам і... настроем.

— А як наконт вольнага часу? Чым ён у цябе заняты?

— Вольныя хвіліны здараюцца не часта. Але калі яны і бываюць, то самае прыемнае для мяне — трапляць у цудоўны свет Вялікай Музыкі. Бясконца магу слухаць «Поры года» Чайкоўскага, «Лунную санату» Бетховена. А яшчэ люблю паэзію Ясеніна. Музыка і паэзія мне шмат дапамагаюць.

**Т. ГАЎРУСЁВА.**



**Вылічальны цэнтр — арганізацыя, якой па праву ганарыцца універсітэт. ВЦ выдатна спраўляецца з задачай распрацоўкі праграмнага забеспячэння функцыяніравання аўтаматызаванай сістэмы апрацоўкі інфармацыі Савета Міністраў БССР. Вырашэнне гэтай задачы—актуальнае пытанне народнай гаспадаркі.**

**Сённяшні дзень вылічальнага цэнтра — работа над праблемай аўтаматызацыі праектавання дыскрэтных схем. Абслугоўваючы персанал ЭВМ імкнецца звесці час прафілактыкі вылічальных машын да мінімуму.**

**А. ГАЙДУК.**

**НА ЗДЫМКАХ: машынная зала ЭВМ «ЕС-1020»; старшы тэхнік ЭВМ «ЕС-1020» Ніна Анатольеўна ФЯДОТАВА.**

**Фота А. БАСАВА.**



## ХУТКА—ЭКЗАМЕНЫ

**ГЭТА АДКАЗНЫ ПЕРЫЯД ДЛЯ СТУДЭНТАЎ І ВЫКЛАДЧЫКАЎ. ІМЕННА Ў ЧАС СЕСІІ БУДУЦЬ ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ ІХ ПАЎГАДАВОЙ СУМЕСНАЙ ПРАЦЫ.**

**МЫ СУСТРЭЛІСЯ З НАМЕСНІКАМ ДЭКАНА ХІМІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА В. САМАХВАЛАМ.**

**— Калі ласка, Віктар Васільевіч, раскажыце, якая работа вядзецца на Вашым факультэце па падрыхтоўцы да сесіі?**

— Што датычыць арганізацыйнага боку гэтай справы — тут усё ў парадку. Ужо складзен і зацверджан рэктарам БДУ распарадак здачы экзаменаў на факультэце, распланаван час для кансультацый. Ёсць у нас таксама і адно невялікае наватвядзенне. Раней студэнты, дамовіўшыся з выкладчыкам аб дадатковай кансультацыі, вывешвалі аб'явы дзе прыйдзецца. Гэта складала некаторую цяжкасць, нязручнасць для студэнтаў. Цяпер для аб'яў аб дадатковых кансультацыях існуе асобны стэнд.

Зусім нядаўна на факультэце адбылася сумесная нарада дэканата, акадэмічнай камісіі і куратараў, дзе ішла гаворка аб бягучай паспяховасці на I—III курсах. На нараду з мэтай больш дакладнага высвятлення спраў у групах былі запрошаны выкладчыкі хімфака.

Хачу падкрэсліць, што для дэканата, як і для студэнтаў, сесія— таксама адказнае выпрабаванне.

**— Як Вы лічыце, у час падрыхтоўкі да сесіі што з'яўляецца галоўным!**

— Уменне правільна распланаваць свой час. А наогул я лічу, што для паспяховай здачы трэба сістэматычна — на працягу усяго семестра — самастойна працаваць над падручнікамі.

**— У чым заключаюцца цяжкасці для студэнтаў-першакурснікаў!**

— Прывыкнуць да новай самастойнай сістэмы працы, не падобнай на школьную. Многае ў гэты перыяд залежыць і ад атрыманай у школе падрыхтоўкі.

Я думаю, што першакурснікі нас не падвядуць. Яны вельмі сур'ёзна займаліся восенню, былі ўважлівымі на лекцыях.

На хімічным факультэце ўжо паўтара месяца існуе акадэмічная камісія, у састаў якой уваходзяць акадэмічны сектар камітэта камсамола хімфака, прадстаўнікі прафбюро, актыўныя камсамольцы. Камісію ўзначальвае намеснік сакратара камітэта камсамола факультэта **Л. Круль.**

**ЁН АДКАЗАЎ НА НАСТУПНЫЯ НАШЫ ПЫТАННІ:**

**— Калі ласка, раскажыце больш падрабязна аб функцыях і мэтах акадэмічнай камісіі?**

— Галоўным з'яўляецца вырашэнне праблемы павышэння бягучай паспяховасці і наведвальнасці. Зараз у нас праходзіць дэкада стопрацэнтнай наведвальнасці студэнтамі заняткаў і выдатнай паспяховасці. Усё шырэй разгортваецца сацспаборніцтва паміж акадэмічнымі групамі «Ніводнага адстаючага побач!»

Мы праводзім сумесна з дэканатам рэйды-праверкі ў студэнцкім інтэрнаце. Высвятляецца, як студэнты рыхтуюцца да заняткаў, чым займаюцца ў вольны час. Усе матэрыялы рэйдаў перадаюцца ў камітэт камсамола. Як вынік нашай апошняй праверкі ў інтэрнаце № 2—выпуск «Камсамольская пражэктара».

**— У чым спецыфіка ў рабоце акадэмічнай камісіі напярэдадні сесіі!**

— Канешне, шмат увагі зараз мы ўдзяляем першакурснікам. Важна падрыхтаваць іх да сесіі псіхалагічна. Выдатнікі-старшакурснікі на камсамольскіх сходах патокаў I курса дзеляцца вопытам падрыхтоўкі і здачы экзаменаў, расказваюць, як правільна планаваць рабочы дзень, каб не марнаваць дарэмна дарагі перад сесіяй час. Плануецца стварэнне кансультацыйных пунктаў, дзе ў якасці кансультантаў выступяць студэнты IV—V курсаў.

Асаблівую ўвагу мы аддаём і пятэнцыяльным «хвасцістам», імкнёмся заўсёды трымаць іх у полі зроку. Існуюць у нас і так званыя грамадскія «буксіры». Праўда, эфектыўнасць іх дзеяння яшчэ невялікая.

**А. ЦЯРЭНЦЬЕВА, Л. БУСЬКО.**

## АПОШНІ ЗВАНОК— У СНЕЖНІ...

Закончылася сесія ў пяцікурснікаў гістфака. Зза дy чатыры з паловай гады вучобы. Падагульніць, успомніць студэнцкае жыццё сабраліся выпускнікі гістарычнага факультэта на свой апошні званок.

З пачуццём удзячнасці слухаюць выпускнікі старэйшых сяброў—выкладчыкаў, якія ўвесь час былі побач са студэнтамі, аддавалі шмат сіл, каб перадаць будучым гісторыкам веды і вопыт.

Яшчэ першакурснікамі памятае выпускнікоў намеснік дэкана А. Кляцкоў. Ён сустрэў іх, працаваў з імі, выхоўваў, каб былі яны сапраўднымі настаўнікамі, і восць праводзіць на самастойную працу...

Дружнымі апладысментамі сустрэлі выпускнікі выступленне свайго куратара Ядвігі Паўлаўны Навуменкі:

— Любіце сваіх падапечных, і тады вам лёгка будзе працаваць. Поспехаў вам, мае дарагія!

Пажаданне — быць вернымі сваёй прафесіі, ніколі не забываць сваю альма матэр — універсітэт — выказаў сакратар партыйнага бюро факультэта Д. Мельцар.

Ад імя ўсіх студэнтаў першага курса дарагіх выпускнікоў павіншавала Ірына Левіна. Яна запэўніла прысутных, што першакурснікі стануць дастойнай зменай выпускнікоў.

Вясёлы смех суправаджаў расказ стараст Міхаіла Жэўно і Юрыя Блашкова аб першай лекцыі.

Урачыстая хвіліна — перадача «пяцёркі» і «партфеля з ведамі» першакурснікам. Выкладчыкам у гонар шчырай павагі і любві паднесены кветкі.

Цікавую праграму мастацкай самадзейнасці падаравала імяннікам агітбрыгада факультэта.

**Я. ДУБРОЎСКІ, Ф. БАРОДКІНА.**

**Матэрыялы тэматычнага развароту падрыхтавалі студэнты I групы II курса факультэта журналістыкі.**

# БУДНІ ПЕРАД СВЯТАМ

# 1976



*Залатыя сняжынкі ўсыпалі святочную залу. Жарты і смех, песні і музыка... Праз хвіліну ўсё сціхае.*

*Узнімаецца занавес, і дружныя воплескі вітаюць вядучых А. Мароз і Э. Астроўскага. А потым А. Кузьмін і Г. Александровіч пад акампанемент гітары выканалі песні «Поле цудаў», «Поры года», «Дыялог ля навагодняй ёлкі». Сваё майстэрства паказаў танцавальны калектыў. Доўга апладзіравалі гледачы Н. Карповіч за песні «Салодкая ягада» і «Старыя словы».*

*Канцэртная праграма навагодняга вечара на хімфаку была нібы першай ластаўкай новага, 1977 года.*

*М. БАЖКО. Фота аўтара.*

## УСЕ ДАРОГІ ВЯДУЦЬ У БІБЛІЯТЭКУ

**Кнігі... Яны заўсёды прыцягваюць да сябе людзей, служаць крыніцай пазнання, выхоўваюць маральныя якасці.**

**...Зараз мы знаходзімся ў бібліятэцы універсітэта. Невялікае інтэрв'ю ў студэнткі факультэта журналістыкі Антаніны Губіч.**

**— ЯК ЧАСТА ВЫ КАРЫСТАЕЦЕСЯ ПАСЛУГАМІ БІБЛІЯТЭКІ?**

**— За патрэбнай літаратурай я заўсёды прыходжу сюды. Тут можна атрымаць добрую параду, дзе набыць тую ці іншую кнігу.**

**Асабліва многа чытачоў наведвае бібліятэку ў гэтыя перадсесійныя дні. Прыемна, што бібліятэкары загадзя паклапаціліся аб тым, як лепш задаволіць студэнта, дапамагчы яму добра здаць экзамены.**

**Работнікі бібліятэкі сваёй галоўнай задачай лічаць звесці да мінімуму час, затрачваемы на аднаго чытача. Для гэтага ўведзена групавое абслугоўванне студэнтаў малодшых курсаў. Супрацоўнікамі вывучаны дысцыпліны па вучэбных планах для таго, каб раўнамерна раскамплектаваць літаратуру, каб у кожную акадэмічную групу папалі неабходныя кнігі.**

**Крыху інакш абстаіць справа са студэнтамі III—V курсаў. Яны вывучаюць спецыяльныя дысцыпліны. У бібліятэцы па спецкурсах складзена картатэка. Трэба сказаць, што дапаможнікаў яшчэ мала. Сёння многае робіцца для таго, каб увесці групавое абслугоўванне і сярод старшакурснікаў. У новым, 1977, годзе бібліятэка пяройдзе на гэты метад работы.**

**А зараз, у час падрыхтоўкі да зімовай сесіі, работнікі бібліятэкі працуюць без выхадных з 9 гадзін раніцы да 10 гадзін вечара.**

**Р. ГАЙСЕНАК,**
**А. ДУНЕЦ.**

## Пазыўны радыёфізікаў—«Інтэграл»

«Кваліфікацыя — радыёфізіка». Такі запіс будзе стаяць у дыпломах выпускнікоў факультэта радыёфізікі і электронікі БДУ імя У. І. Леніна.

Яшчэ нядаўна гэты факультэт быў аддзяленнем фізфака. Зараз ён самы малады ва універсітэце, яму ўсяго толькі паўгода.

Шматпавярховы будынак навукова-даследчага інстытута прыкладных фізічных праблем у Шчамысліцах акружае сасновы лес. Тут жа размешчан і інтэрнат студэнтаў.

Вучацца на факультэце 529 студэнтаў на дзённым аддзяленні і 220 на вячэрнім.

Перад навагоднім святам мы сустрэліся з дэканам факультэта радыёфізікі кандыдатам фізіка-матэматычных навук, дацэнтам А. Лабудай і папрасілі яго расказаць аб сувязі факультэта з вытворчасцю, падзяліцца планамі на будучае.

**— Антон Антонавіч, раскажыце, калі ласка, якія формы навуковай студэнцкай работы існуюць на вашым факультэце?**

Пачынаючы з II—III курсаў, студэнты ўключаюцца ў навукова-даследчую дзейнасць. Яны працуюць у навукова-даследчай лабараторыі, студэнцкім вылічальным цэнтры, а таксама ў даследчых лабараторыях кафедр ПФП.

— Перад студэнтамі ставіцца вырашэнне канкрэтнай праблемы, маючай непасрэднае прымяненне на практыцы. Кіруе лабараторыяй былы наш выпускнік, зараз старшы выкладчык У. Мікуловіч.

**— Напэўна, кафедры падтрымліваюць цесную сувязь з вытворчасцю?**

Так, сапраўды, у большасці выпадкаў яны працуюць па заданнях многіх прадпрыемстваў краіны. У гэтым годзе па дагаворах выканана работ на паўтара мільёна рублёў. Не адстаюць СНДЛ і СВЦ: адпаведна на 80 тысяч і 25 тысяч рублёў.

Лабараторыяй СНДЛ распрацаван аналізатар для кантролю работы рухавікоў. Гэта прыбор, з дапамогай якога можна вызначыць дэфекты машынных дэталей па іх шуму, не заглядваючы унутр. Прыбор дэманстраваўся на ВДНГ і быў удастоен бронзавага медаля.

**— Антон Антонавіч, скажыце, калі ласка, дзе знаходзяць прапіску маладыя спецыялісты-радыёфізікі?**

— Кожны год мы павінны даваць палову свайго выпуску «Інтэгралу». Тут у рамках навукова-вытворчага аб'яднання «БДУ — «Інтэграл» праходзіць практыку большасць нашых студэнтаў.

**Т. БЯЛІЦКАЯ,**
**Л. АСТАПОВІЧ.**

## ПЕРШАЕ ВЫПРАБАВАННЕ

Сесія... Праз тыдзень-другі пачнуцца першыя экзамены. А пакуль што студэнты здаюць залікі.

Дзве гадзіны дня. З цяжкасцю праціскаюся да аўдыторыі, дзе студэнты II курса геаграфічнага факультэта здаюць залік па геамарфалогіі. Адны стараюцца выкарыстаць апошнія хвіліны, каб прагледзець падручнік або канспект, іншыя імкнуцца лепей схаваць шпаргалку, каб нават самае зоркае вока выкладчыка не магло яе заўважыць...

Пакуль студэнты рыхтуюцца да адказаў, можна пагаварыць з экзаменатарам. Выкладчыца Л. Мар'іна расказвае мне, што геамарфалогія — гэта навука аб форме рэльефу зямной паверхні, гаворыць аб гісторыі яе развіцця ў часе і прасторы. Прадмет даволі складаны. Проста так залік не атрымаеш.

Акрамя Л. Мар'інай, залік прымае і В. Калечыц, таму адразу маюць магчымасць адказваць два студэнты. Спакойна і ўпэўнена адказвае Ларыса Цішкова па білету.

...Уваходзіць дзяўчына і неяк баязліва набліжаецца да выкладчыка. Некаторы час гадае, які білет узяць, а потым, закрыўшы вочы, бярэ першы, які папаўся. Узрадавалася — значыць ведае пытанне.

Прысутнічаеш на заліку — нібы падарожнічаеш па зямлі. У адказах студэнтаў — шэраг геаграфічных назваў. На карце паказваюць яны розныя аб'екты, расказваюць аб развіцці і сучасным стане рэльефу розных частак Зямлі.

Залік атрымліваюць амаль усе. Але бывае, што ад хвалявання нехта забудзецца нават, дзе знаходзіцца Днепр, і шукае яго на захадзе Беларусі, ці Ашмяны раптам апынуцца на Палессі. Гэтага ўжо выкладчык не даруе і далікатна прапануе прыйсці ў другі раз.

Падыходжу да студэнткі, якая ўжо падрыхтавалася да адказу, і пытаюся аб яе настроі. Таццяна Кіеня ўсміхаецца: пытанні яна ведае нядрэнна.

На гэтым заліку ў недасведчанага чалавека выклікаюць здзіўленне такія назвы, як «цукровая галава» ці «бараноў лоб». Але праз некаторы час і я ўжо ведаю, што «цукровая галава»—гэта форма выветрывання рэльефу, якая сустракаецца ў трапічных і субтрапічных зонах. А «барановы лоб» —гэта, аказваецца, не што іншае, як цвёрдая парода, апрацаваная ледніком.

Студэнт, што быў апошнім (не будзем называць яго прозвішча), неяк няўпэўнена адказваў. Было відаць, што ён не вельмі рыхтаваўся да заліку. Таму і прыйшлося яму пакінуць аўдыторыю з пустой залікоўкай.

А вось і вынікі. Са 125 чалавек залік па геамарфалогіі не здалі толькі трое. Пакідаў я аўдыторыю разам з выкладчыкамі. Ля іншых аўдыторый яшчэ стаялі студэнты. У іх выпрабаванне было яшчэ наперадзе.

**В. ГЕДРОЙЦ.**

## У агітбрыгады ФПМ— дзень нараджэння

Афіцыйная дата яе нараджэння—21 снежня 1970 года. Гэта значыць, шэсць гадоў назад.

...Артысты размясціліся проста на прыступках фае інтэрната № 6. Дарэчы, ім не прывыкаць. Агітбрыгадзе даводзілася даваць канцэрты і не ў такіх умовах. Ды так, напэўна, і цікавей. нават падобна на выступленні вандруючых акцёраў шэкспіраўскіх часоў.

У іх сёння своеасаблівы, стаўшы нават традыцыйным, справаздачны канцэрт. Гэта 104-ы канцэрт. у жыцці агітбрыгады. У праграме—самыя лепшыя, самыя «адточаныя» нумары. Акцёры тут, можна сказаць, універсальныя. Кожны павінен умець і добра спяваць, і танцаваць, і прыгожа дэкламаваць. Па такому прынцыпу і адбываецца адбор у агіткалектыў брыгады. Сяргей Бобаў, Галіна Абашава, Наталля Баравікова, Леанід Цюлюпаў, кіраўнік агітбрыгады Уладзімір Сячко... Гэтыя людзі да канца верныя свайму «дзецішчу», адносяцца да яго з кранаючым клопатам і ўвагай. Яны працуюць з задае грамадскіх даручэнняў стаяў плюс.

Кожная канцэртная праграма прадумваецца і абмяркоўваецца ўсімі членамі брыгады. Напэўна таму на агульнаўніверсітэцкім аглядзе агітбрыгад, адбыўшымся ў 1974 годзе, іх праграма «Мінск—горад-герой» заваявала першынство, а на абласным семінары кіраўнікоў агітбрыгад адзначалася як адна з лепшых студэнцкіх.

У калектыва агітбрыгады ўжо склаліся свае добрыя традыцыі. Кожны год у час зімовых канікул агітбрыгада ў поўным саставе на некалькі дзён выязджае ў адзін з раёнаў Мінскай вобласці. У апошні раз студэнты далі 12 канцэртаў.

Наперадзе ў рабят яшчэ многа работы. Наперадзе — агляд мастацкай самадзейнасці універсітэта, дзе брыгада збіраецца выступіць з новай праграмай «Юнацтва абвінавачвае імперыялізм».

Усё гэта робіцца з энтузіязмам і ўлюбёнасцю ў сваю справу. Усё гэта і завецца агітбрыгадай.




## ПЕРАМАГЛІ МАЦНЕЙШЫЯ

Спортам мужных і мацнейшых называюць барацьбу самба. І той, хто раз і назаўсёды выбраў гэты від спорту, адкрывае праз яго цэлы свет, вялізны і складаны, выхоўвае вынослівасць, сілу волі і спартыўны характар.

Гэта яскрава прадэманстравалі спаборніцтвы па барацьбе самба на першынство універсітэта, якія нядаўна закончыліся. Удзел у іх прынялі каманды 11 факультэтаў БДУ. Першае месца заняла дружная каманда ФПМ, набраўшая 146 ачкоў, другое — каманда радыёфізічнага факультэта.

Усе члены зборнай універсітэта пацвердзілі сваё майстэрства. Паспяхова выступілі П. Арлоў (біяфак), В. Клімаў (юрфак), У. Рубанаў (ФПМ) і іншыя. Добра зарэкамендавалі сябе і навічкі С. Рудкоўскі (факультэт радыёфізікі), М. Халімончыкаў (журфак).

## СТАРТАВАЛІ ЛЫЖНІКІ

Традыцыйнымі спаборніцтвамі на прыз газеты «Вячэрні Мінск» адкрыўся лыжны сезон. У ім прынялі ўдзел каманды прадпрыемстваў, ВНУ і тэхнікумаў г. Мінска. Паспяхова выступіла наша зборная, гонар якой на працягу ўжо некалькіх год абараняюць такія спартсмены, як Я. Рашкевіч (геафак), А. Алакіна (ФПМ), А. Калдачоў (фізфак), А. Баравы (фізфак) і іншыя. Яны будуць абараняць гонар універсітэта на гарадскіх і рэспубліканскіх спаборніцтвах.

Наперадзе — новыя старты!

## ВЫЙШЛІ Ў ФІНАЛ

Працягваюцца спаборніцтвы жаночых і мужчынскіх каманд па валейболу. Спаборніцтвы ўваходзяць у гадавую спартакіяду універсітэта. Выйшлі ў фінал і будуць змагацца за званне пераможцаў мужчынскія і жаночыя каманды хімічнага, гістарычнага і механіка-матэматычнага факультэтаў, а таксама жаночая каманда ФПМ і мужчынская — радыёфізічнага факультэта.

Барацьба працягваецца.

**Л. ДРАЗДОВА.**



**На здымку: сустрэча хімфак—журфак (2:0).**

**Фота А. БАСАВА.**

З Новым годам! З Новым годам!




Последние дни уходящего года для сотрудников кафедры общего смеходелия были чрезвычайно хлопотные. Старпреп Конспектов, расширяя свои залысины, спешно заканчивал очередное исследование по эстетике хохота.

«Вся жизнь впереди, исследуй и жди!»—под таким эпиграфом планируется публикация его работы на страницах «кафедры».

Новый сотрудник Водоливов, заканчивая текущий год, буквально растекался по всем главным направлениям учебной и научной работы кафедры. По новому учебному плану число лекционных часов для студентов сокращалось с 8 до 6 в день, что дало возможность внести в расписание минимум по две пары практических ежедневно.

Задачам дальнейшего изучения студенческой жизни была посвящена и новая монография Водоливова «Воду доливайте сами», выдвинутая на соискание ученой степени кандидата истерических наук.

Лаборант Писулькин, проведя небольшое социологическое исследование накануне Нового года, пришел к заключению, суть которого в следующем: стопроцентная посещаемость на курсах бывает раз в месяц и выпадает на дни выдачи стипендии. Исходя из этого, деканату были даны соответствующие рекомендации по повышению посещаемости.

Доцент Незачетов к концу этой недели планировал организовать и провести на кафедре диспут о любви с первого взгляда, но... грянул Новый год!

НАШЫ ПЛАГІЯТЫ

## Для вас, навуковыя супрацоўнікі

Добры вечар, дружок! Вось і ноч прыйшла. Усе ўжо даўно спяць. І Вадзік, і Боб, і лазер, і мазер. І дыёды таксама спяць. Адзін ты ўсё сядзіш над сваёй дысертацыяй. Ведаю, ведаю, хочаш хутчэй абараніцца. Не хвалюйся, дружок! І ты абаронішся. Дай час—станеш кандыдатам. І нікуды ты не дзенешся. А зараз пара «бай-бай». А каб ты хутчэй заснуў, раскажу табе казачку.

Жылі-былі малодшыя навуковыя супрацоўнікі Дзедаў і Бабаў. І быў у іх кіраўнік Курарабаў.

Вось аднойчы Дзедаў з Бабавым гавораць Курарабаву:

«Ёсць у нас ідэя, шэф. Ды не простая, а залатая».

Узрадаваўся Курарабаў, аднёс гэтую ідэю ў рэдакцыю часопіса. І атрымаўся ў Курарабава добры артыкул. Дзедаў плача. Бабаў плача. А Курарабаў іх суцяшае:

«Не плач, Дзедаў! Не плач, Бабаў!! Народзіце сабе новую ідэю. У вас яшчэ ўсё наперадзе».

І сапраўды, нарадзілася ў хуткім часе ў Дзедава з Бабавым новая ідэя. Простая, як калумбава яйка.

Курарабаў яе біў, біў—напалову разбіў.

Вучоны савет яе біў, біў—амаль дабіў. Зусім мала засталося.

Праязджаў тымі месцамі з сімпозіума на сімпозіум Мышкіс — Аўтарытэтны Мужычок. Узмахнуў ён брывом і гаворыць:

«Ідэя добрая!»

А ўжо калі Мышкіс—Аўтарытэтны Мужычок так гаворыць, значыць і сапраўды ідэя добрая.

І сталі Дзедаў з Бабавым кандыдатамі. А Курарабаў нават доктарам стаў.

І закаціў банкет на сто пярсон. Я там быў, каньяк піў. Армянскі...

Вось і казачцы канец. А цяпер кладзіся на правы бачок, вочкі закрый і спі. Спакойнай ночы, дружок!

# ДВОЕ

(ГУМАРЭСКА)

— Не тыя часіны, не тыя, — сказаў першы.

— Так, так, — пагадзіўся другі.

— Надоечы пра туманы і дажджы паэму змайстраваў і, ці верыш, — усю сам. А ў рэдакцыі мне і кажуць: «Усё добра. Пачатак добры, і потым добра, але... месцы ёсць у вас падобныя, як у іншых». Гэта ён мне зразумець дае, што я здзёр у некага.

— Ай-я-ёй!

— Вось табе й на: «Ай-я-ёй!» Усю ноч пацеў. Ногі ў шайку з гарачай вадой, і пацеў над паэмай. А ён, бач ты, мне намёкі розныя робіць. Крыўдна. Мне і хвалявацца, можна сказаць, яшчэ супрацьпаказана, нервовая сістэма разбураецца і сэрца псуецца. А тут...

— У мяне, — перапыніў другі, — не лягчэй. Думаю, свет здзіўлю. Оперу «Маленькія каты» напісаў, а мне: «Было».

... Паклікаў званок. І двое, абмінаючы настаўніцу, слізганулі ў дзверы свайго роднага 1-га «Б» класа.




## Факультет великоЛЯПия

ИЗ ПИСЕМ В РЕДАКЦИЮ

Я просил их о возвращении меня в первобытное состояние, т. е. о восстановлении меня в университете.

Моя голова, к собственному моему удивлению, начинала временами думать сама.

Все мои попытки напечататься не обвенчались успехом.

Из его статьи выпал идейный стержень, мне кажется, автор его потерял.

Автор умеет правильно истрактовать тему, хотя и не блестит в смысле изложения материала.

ПРЕДЭКЗАМЕНАЦИОННАЯ КОНСУЛЬТАЦИЯ

## КАФЕДРА ТРАКТУЕТ:

**СЕССИЯ** — стихийное бедствие, отличающееся завидной постоянностью.

**ЕДИНИЦА** — балл, от которого прочно застрахован студент. В этом основное отличие высшей школы от средней.

**ЛЕНЬ** — матушка. На Олимпе — богиня, покровительница студентов.

**НЕДЕЛЯ** — для студентов состоит из субботы, воскресенья и пяти дней подготовки к ним.

**ДИПЛОМ** — «конечный смысл всей мудрости земной». (Гёте).

# НАШЫ ДЫЯЛОГІ

— Паслухайце, — сказаў дацэнт Незалікін, ставячы двойку студэнту, які ў трэці раз правальваецца на экзамене,—чаму вы не працуеце? Урэшце ад вучобы яшчэ ніхто не памёр!

— Я ведаю,—адказаў Шура Шпора,—але лепш не рызыкаваць!

* * *

ДАЦЭНТ НЕЗАЛІКІН:
— Чаму вы ўвесь час павышаеце мяне ў званні? Я не прафесар, а дацэнт.
ШУРА ШПОРА:
— Я спадзяюся, што вы адкажаце мне ўзаемнасцю, ацэньваючы мае веды на экзамене.

* * *

ВЫКЛАДЧЫК КАНСПЕКТАЎ:
— Вы самі рашылі гэтую задачу?
ШУРА ШПОРА:
— Не, пры дапамозе двух невядомых.

* * *

— Дарагая мама,—піша Гоша Паінькін маці,—я праваліўся на экзаменах. Падрыхтуй да гэтага непрыемнага паведамлення тату.

— Дарагі сынок,—адказвае маці,—тата падрыхтаваўся, падрыхтуйся і ты!

Старонку кафедры па ўласнаму жаданню аформіў **В. ГАЙ-ДЗЯЛЯНКА.** Ён жа і матэрыялы рыхтаваў.

Між іншым, гумарэска «Двое» належыць пяру **М. КУРГАНСКАГА,** а ТЭС і аб'ява — **В. МАРТЫНЕНКІ.** Рэдакцыя з нецярплівасцю чакае вашых новых пісем, чытачы!






# ТЭС

ПОДРОБНОСТЬ—(морск.) одежда, одеваемая под робу.
ПОДВОДА—агрегат, плавающий под водой.
КАРЬЕРИСТ—экскаваторщик, работающий в карьере.
ІВАН-ДА-МАРЬЯ—молодожены.
ЗНАЧОК—любознательный человек.
НАХЛЕБНИК—комбайн.
ИВАН-ЧАЙ—бывший алкоголик.

## ДОСКА ОБЪЯВЛЕНИЙ

В целях устранения всяческих инцидентов между портными, сапожниками, парикмахерами, с одной стороны, и их клиентами, с другой, в новом микрорайоне будет открыт **комбинат бытового самообслуживания.**




# ЭЛЕГИЯ-ТРИПТИХ

Мама-мамочка,—
гибнет молодость—
забери меня отсюдова.
(Надпись на парте).

I

В те дни, когда, как
в лихорадке,
Мое студенчество трясет,
И каждый думает украдкой,
Авось, счастливо пронесет;
И каждый лучшие одежды
Вдруг одевает на себя,
И безнадежность и надежды—
Все одинаково любя;
И все так вежливы при встрече
С преподавателем своим;
И реже плавает под вечер
В курилках «благовонный
дым»;
А в коридорах общежитий —
«Спихнул», «зарылся»,
«пролетел»...
И комендант, как укротитель,
Уже как будто не у дел;
Все ждут, дыханье
затаили:
В последних числах января
Над кратким списком чьих
фамилий
Взойдет стипендии заря?

II

В такие дни под вечер где-то,
Когда неиствует пурга,
Брожу я, мыслию согретый,
Что до диплома — три шага,
Что время все же быстротечно,
Над головой шумит-шумит...
И дышит грудь, как мех
кузнечный,
И бодрость сердце веселит.
Иду, любуюсь на природу,
Хоть завтра снова—чет не чет—
Экзаменатор Незачетов
Поставит новый незачет.
Но я горжусь при этом званьем,
Негромким званием: студент,
Горжусь, что слушал со
вниманьем
Одних лишь лекций—пару лет.
Люблю при встрече Шпору
Шуру
Благим советом подкузьмить,
Мол, клинья под аспирантуру
От первых сессий надо бить.

III

Мое студенчество, к тебе я
С тех незапамятных времен,
Когда я в вуз пришел, робея,—
Своею лирой обращен.
Душой, открытою для страсти,
Тебе я лучшее дарил,
И говорил: «Не в тряпках
счастье,
Отнюдь не в тряпках!»—
говорил.
Под Новый год, когда итожу
Еще один нелегкий круг,
Мне, между тем, всего дороже
Твоя воспитанность, мой друг.
Ведь больно, больно мне за
партой,
Тобой исписанной, сидеть,
Где все в чернилах и помарках:
Как прочитать—так покраснеть.
И очень жаль, скажу я прямо
(Пускай бы молодость цвела!),
Мне очень жаль, что чья-то
мама
Мольбе дитяти не вняла.

Ш. Ш.,
студент.

В. а. рэдактара В. А. ВОЛЬСКІ

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Аб'ём — 1,5 друк. ар. Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз. АТ 01642 Заказ № 1853

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.